**Грынкевіч В.У. (Мядзел)**

# “Імперыя, у якой не заходзіць сонца…”: верлібры Максіма Танка

Назву артыкулу даў верш-верлібр “На экзамене”:

У мяне спыталі:
У якой імперыі
Не заходзіць сонца?
Я адказаў: – Толькі ў адной –
У імперыі паэзіі… [4, с.23]

Сярод мастацка-эстэтычных багаццяў беларускай літаратуры выдатнае месца займае паэзія Максіма Танка – нашага сучасніка, земляка, якога мы разам з тым успрымаем і як класіка, які даў непераўзыдзеныя ўзоры лірыкі і эпасу. Для паэта вершы – і радасць, і прызванне, і праклён, і шчасце, і мука, і свяшчэнны абавязак. Разам з тым – гэта здольнасць па-новаму зірнуць на жыццё чалавека, адкрыць невядомыя дасюль грані чалавечай натуры, паказаць новыя грані сувязі чалавека з прыродай, грамадствам, людзьмі.

Вядома, што Максім Танк аддаваў перавагу не класічнаму вершу, а верлібру, які, мне здаецца, мае свае перавагі, калі на першы план выходзіць паэтызацыя думкі. Сапраўды, у верлібры думка выяўляецца ў найбольш адкрытым, часта як бы аголеным выглядзе. У адрозненне ад звычайнага верша, яна не прыкрываецца ні мілагучнасцю мелодыкі, ні пявучасцю радка, ні выразнасцю дакладна вытрыманага рытму, ні рыфмай. Верлібр не без цяжкасці прыжываецца ў нас, можа, і таму, што тут адразу выяўляецца адсутнасць ці імітацыя глыбіннай паэтычнасці на ўзроўні руху самой думкі. Максіму Танку не даводзіцца гэтага баяцца, бо ён і ў сваіх верлібрах, і ў вершах звыклых умее так павярнуць думку, знайсці такія нечаканыя адценні яе сэнсу, што яна сама, без упрыгожанняў пачынае вылучаць моцнае паэтычнае святло. У часопісе “Полымя” знаходжу артыкул, дзе паэт робіць удакладненне: “Ранні верлібр – спроба, звязаная з пошукамі выхаду за межы класічнага верша, – спроба інтуітыўная, якая толькі ў пазнейшыя гады знойдзе сваё “тэарэтычнае” абгрунтаванне ў маёй паэзіі”.

Лірыка Максіма Танка ў сваім штодзённым бытаванні вельмі арганічна суадносіцца з вечнымі пытаннямі чалавечага быцця, не выпускае з поля зроку вечных тэм: што такое свет і што такое чалавек, што ёсць ісціна, сумленне, вера, каханне… Ён ведае: тое, што тысячагоддзі хвалюе чалавецтва, хвалюе і яго.

Спрадвеку
Абследуем галактыкі.
І пакуль што нідзе,
Апроч Зямлі,

РЭПОЗІТОРЫЙ БГПУ

Не знайшлі слядоў
Жыцця.
Калі сапраўды
Мы – самотныя ў сусвеце,
Як жа нам трэба з табой
Даражыць нашай
Дружбай! [3, с. 39]

Гуманізм паэта бачыцца ў высакароднасці яго чалавечай натуры, у яго душэўнай далікатнасці.

У вершы-верлібры “Перапіска з зямлёй”, які адкрывае аднайменны зборнік, сцвярджаецца веліч працы чалавека, які ўсё жыццё прысвяціў зямлі і плугу. Лірычны герой пісаў да зямлі лісты пяром, “смыкамі ўсіх скрыпак”, “пісаў спіцамі дрогкіх калёс, якарамі і мачтамі караблёў, штыком і сапёрнай лапатай”, “кубкамі, з якіх п’юць”…

Але пакуль што
Адказ атрымаў я
Толькі на ліст мой,
Напісаны плугам.
Вось ён.
Парэжце на скібы яго.
Частуйцеся.
Ешце [2, с. 7].

Сэнс сваёй паэзіі Максім Танк бачыў у цеснай еднасці з жыццём людзей працы, з сённяшнім жыццём, трывожным і неспакойным.

У дзённіку 1930-х гадоў паэт пісаў: “Усё часцей думаю пра мяжу, якая аддзяляе паэзію ад прозы. А магчыма, яе зусім няма”. Максім Танк быў перакананы: “Без адкрыццяў не можа быць сучаснай паэзіі, і пакуль што ходзім, трымаючыся за кастылі старых традыцый, уяўленняў, густаў, глухія да крыку новых дзён… Паэзія наша – цяжкая, як камень, вырваны з бруку падчас вулічных баёў, немілагучная – як стогн ці крык, чырвоная – як пралітая кроў. Іншай яна сёння і не можа быць”, – запісвае ён у дзённіку. У гэтай самахарактарыстыцы і адлюстраваліся асноўныя параметры індывідуальнага стылю. “Мне здаецца, што няма ў нас месца, дзе не было б паэзіі. Яна вакол нас, як паветра”, – яшчэ адна вытрымка з даваеннаснёўскага дзённіка паэта. Па праўдзе кажучы, усе яго кнігі прасякнуты адчуваннем паэзіі жыцця, якое ён здольны ўспрымаць усёй сваёй чалавечай істотай, страсна, з хваляваннем. Яго аблічча звязваецца ў нашай свядомасці з вобразамі нарачанскага краю, яго зямлёю і лясамі, яго працавітымі людзьмі. Гэта – радзіма паэта. Яна ўзгадавала ягоны талент, песню і азначае для паэта

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вельмі і вельмі шмат. І там, дзе ён гаворыць пра ўсход сонца, пра бляск лемяхоў, што аруць гэтую скупую зямлю, пра свой неўміручы мужыцкі род, пра старую хату, у дзверы якой ламаліся ўсе войны, усе буры веку, нарэшце, пра цудоўную беларускую восень, – усюды адчуваецца нацыянальны характар паэта, гістарычны лёс і духоўны склад яго народа. Ярка рамантычныя, духоўна прасветленыя вобразы Танка спалучаюць у сабе ўзнёслае і зямное.

Максім Танк заўсёды многа і плённа працаваў. Як вынік гэтага ў перыядычным друку часта з'яўляліся яго новыя творы, выходзілі новыя аб'ёмністыя кнігі паэзіі. Усё гэта з вялікай увагай сустракалі чытачы.

Паэзія Максіма Танка, народнага паэта Беларусі, сагрэта дабрынёй і даверам да чалавека. У паэзіі Танка жыве чалавек дзейсны і мужны, дасціпны і іранічны, мудры і па-дзіцячы непасрэдны адначасова. У яго вершах спалучыліся талент і вопыт, думка набыла выразнасць і пераканаўчасць афарызма.

Максім Танк – гэта майстар вострай формы, чыя выяўленчая палітра надзвычай багатая. У яго кнігах назіраем цікавы зварот да міфалагізацыі, вельмі гуманістычнай па сваёй сутнасці.

Зямля трымаецца на трох сланах,
Сланы – на велізарнай чарапасе,
Чарапаха – на голубе,
Голуб – на хлебным коласе,
Колас – на калысцы,
А калыска – на песні матчынай…
І пакуль песня будзе гучаць,
Калыска будзе калыхацца,
Зерне прарастаць,
Голуб – віць гняздо пад страхой,
Чарапаха – ісці Млечным Шляхам,
Сланы – пераступаць з нагі на нагу, –
Зямля будзе век
Зелянець, зелянець, зелянець… [4, с. 262]

Напрыклад, у вершы "Пісьмо ваенкому" паэт просіць не спісваць яго з ваеннага ўліку нават у тым выпадку, калі ён падарвецца на міне, бо "спецыяльнасць мая – спецыяльнасць сапёра, які ўсё жыццё размінірвае шляхі да любові, дружбы, міру". Дакладнаму і эмацыянальнаму выражэнню багацця думак, глыбокіх па сэнсу і свежых па гучанню, у дадзеным выпадку найбольш адпавядае верлібр (парушэнне традыцыйнага вершаванага рытму

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выглядае зусім правамерным, яно лагічна падкрэслівае, адцяняе асобныя словы-вобразы, сэнс кожнай думкі, пафас прамовы).

Зусім іншы рытм у вершы “Як аб пеpажытым…”. Ён удала перадае задуменнасць паэта, яго споведзь перад светам, што ўсё ж вельмі цяжка расказаць “аб перажытым народа майго”, бо

… найболей трывалыя словы
Разлічаны толькі
На цяжар матыля, а не на ўздых
Маці асірацелай,
На звон пчалы, а не на звон дроту калючага,
На кроплю расы, а не на кроплю крыві,
На маўчанне зямлі, а не – попелу [4, с. 254].

Паэтычныя паралелі (“цяжар матыля” і “ўздых маці асірацелай”, “звон пчалы” і “звон дроту калючага”, “майскі звон” і “гром кананады” і г.д.) напоўнены вялікім сэнсам, асацыяцыямі, гучаць узнёсла, нібы выхаплены з палкай прамовы. І мімаволі адчуваецца, што такія думкі менавіта можна было выказаць не інача, як у форме свабоднага верша. Рытмічная раскаванасць дапамагае паэту адцяніць, надаць палкае публіцыстычнае гучанне заключным радкам верша:

…мне і словам маім яшчэ трэба
Праз рэкі бурлівыя часу і забыцця
На бераг далёкі, –
Які завуць марай,
Будучыняй, –
Занесці і радасць народа,
Што шчасце здабыў [4, с. 254].

Напрыклад, у верлібры “Я спытаў чалавека…” голас паэта гучыць разважліва, прасветлена, суладна вечнасці і сусвету. У вершы ён дае адказ на пытанне аб тым, што з’яўляецца на гэтым свеце самым цяжкім. У некалькіх радках скандэнсаваны вопыт і думкі цэлых пакаленняў:

Я спытаў чалавека,
Які прайшоў праз агонь,
І воды,
І медныя трубы:
– Што самае цяжкае
На гэтым свеце?
І ён адказаў:
– Прайсці праз вернасць [3, с. 7].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Творчасць М. Танка не з’яўляецца гісторыяй ці ўспамінам пра мінулае. У ёй – будучыня, дзе жыве творчая, вечная душа лірыка:

Я толькі частку невялічкую
Змог праспяваць
Таго, што расказалі мне
Вятры, дарогі,
Валуны і рэкі,
Лясы і зоры;
Я толькі частку невялічкую
Змог перадаць,
Што гаварылі вочы,
Вусны, рукі
Людзей, з якімі жыў і сустракаўся.
Таму пад песнямі маімі
На першым месцы
Подпісы іх стаўце [4, с. 289].

У вершах М. Танка, напісаных верлібрам, не сустрэнеш выпадковага, не апраўданага “ламання” радка, пераходу на іншы рытм. Усё гэта падпарадкавана паэтычнай задачы: раскрыццю пэўнай думкі, сэнсу асобнага слова, падкрэсліванню або выяўленню вобраза ці малюнка. Гэта выразна бачна ў кожным творы, для якога паэт выбраў свабодную ад строгай рытмічнай дакладнасці форму.

У творчасці Максіма Танка, такім чынам, няцяжка адшукаць адказы на ўсе пытанні чалавечага жыцця. Тое, што хвалявала людзей на працягу тысячагоддзяў, хвалявала паэта ў канцы XX стагоддзя. Паэт не стараўся быць модным, сучасным і маладым, хоць часам, жартуючы, і паскардзіцца на гады, што ў вырай адляцелі, ды застанецца сабою, чалавекам, які нялёгкаю працай і змаганнем здабыў сталасць думак, пачуццяў і ацэнак жыцця.

З уласнага вопыту педагога ведаю, што менавіта гэтаю сталасцю думак, пачуццяў і ацэнак жыцця паэзія Танка кранае моладзь. Творы яго, сагрэтыя дабрынёй і вялікім чалавечым пачуццём, сцвярджаюць духоўныя каштоўнасці жыцця, дапамагаюць жыць у наш неспакойны і трывожны час, выхоўваюць у чытачоў душэўную прыгажосць і высокую інтэлектуальнасць.

Памёр паэт, але ён навек застаўся з намі сваёй выдатнай творчасцю, сваім сумленным жыццём. Паэт, Беларус, Асоба, Зямляк, незабыўны Максім Танк. Ён пакінуў не толькі багатую літаратурную спадчыну, але і свае жыццёвыя ўрокі – урокі мудрасці і сціпласці, вернасці Беларусі і ўдзячнасці бацькам сваім, дзядам. Наш абавязак – свята захоўваць і шанаваць памяць пра вядомага свету земляка. Гэтага патрабуе і час, няспынна бегучы ўперад, і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

неабходнасць новых падыходаў да асэнсавання багатай духоўнай танкаўскай спадчыны.

Літаратура

1. Танк, М. Глыток вады / М. Танк. – Мінск, 1972.
2. Танк, М. Перапіска з зямлёй / М. Танк. – Мінск, 1979.
3. Танк, М. Прайсці праз вернасць / М. Танк. – Мінск, 1980.
4. Танк, М. Хай будзе святло / М. Танк. – Мінск, 1979.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ